




# Мы – Захавальнікі ТВП "Пойма ракі Сож"!




## Дзейнічайце разам з намі для захавання прыроды Беларусі!

Калі Вы жывяце каля поймы ракі Сож ці маеце магчымасць наведваць яе, Вы можаце стаць Захавальнікам ТВП "Пойма ракі Сож" і дапамагчы зберагчы яе для нашчадкаў.

Удзельнічайце ў захаванні ТВП "Пойма ракі Сож", паведамляйце пра пагрозы і свае назіранні супрацоўнікам АПБ і прыродаахоўных інспекцый.

## Як далучыцца да нас?

**Заходзьце на старонку**

**www.iba.ptushki.org**

**або тэлефануйце:**

**8 (017) 263-06-13**


**ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны"**

8 (017) 263-06-13, www.ptushki.org
8 (029) 223-06-13, info@ptushki.org
8 (029) 101-68-87 www.vk.com.ptushki
www.fb.com/APB.BirdLife.Belarus



Здымкі: В. Казлоўскі, С. Левы, В. Лукшыц, П. Пінчук, С. Плыткевіч, Т. Раманава, Дз. Якубовіч

Праект DCI-NSAPVD/2012/292081 "Прырода важна для ўсіх. Умацаванне аховы прыроды праз развіццё лідэрства і ўдзел мясцовага насельніцтва ў працэсе прыняцця рашэнняў на мясцовым узроўні" рэалізуецца ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны" пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага Саюза. За змест выдання адказвае ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны"

ООО «РИФТУР ПРИНТ» Свидетельство о ГРИИРПИ № 1/284 от 09.04.2014 г. Типография УП «Джи энд Ди» Свидетельство о ГРИИРПИ № 2/36 от 13.01.2014 г. Тираж 2000 экз. Заказ 413


Грамадская арганізацыя
**"Ахова птушак Бацькаўшчыны"**
www.ptushki.org



Качка-чырка

Тэрыторыя, важная для птушак

# ПОЙМА РАКІ СОЖ

Праект фінансуецца ЕС

BirdLife IBA ТЭРЫТОРЫЯ ВАЖНАЯ ДЛЯ ПТУШАК



Чорны каршун

## Што такое ТВП?

Эфектыўным метадам аховы многіх відаў жывёл і раслін з'яўляецца захаванне прыродных тэрыторый, неабходных для іх існавання. Адзін з падыходаў – гэта выдзяленне ў адпаведнасці з пэўнымі крытэрыямі Тэрыторый, важных для птушак (ТВП), якія забяспечваюць выжыванне папуляцый большасці відаў птушак. Гэта месцы гнездавання, зімоўкі ці міграцыйныя шляхі тых відаў птушак, якія маюць неспрыяльны ахоўны статус або знаходзяцца пад пагрозай знікнення.

Сусветная праграма ТВП ахоплівае 200 краін, больш за 12 000 тэрыторый, з якіх 51 знаходзіцца ў Беларусі.

**Карта Тэрыторый, важных для птушак Беларусі**




## Цікавыя факты пра ТВП "Пойма ракі Сож"

1 Тэрыторыя ўяўляе сабой працяглы ўчастак поймы ракі Сож ад г. Чачэрск да г. Ветка. Шырыня поймы з адкрытымі паплавамі тут дасягае 5–6 км.

2 Сож – другі па даўжыні і воднасці прыток Дняпра. Для біяразнастайнасці ён важны захаванымі поплаўнымі супольнасцямі. Падчас міграцый тут спыняюцца шматлікія чароды качак, гусей, кулікоў розных відаў.



Вялікі грыцук

3 Пойма ракі Сож мае значэнне перш за ўсё для гнездавання поплаўных відаў птушак: куліка-марадункі, вялікага грыцука, дубальта, качкі-чыркі, балотных рыбачак і інш. У Беларусі засталося толькі некалькі падобных паплавоў у прыдатным стане для размнажэння птушак.



Чорныя рыбачкі

4 Старыя лясы паблізу ракі і старыцы, мазаічнасць ландшафту спрыяюць гнездаванню чорнага каршуна – рэдкай драпежнай птушкі, чыя колькасць скарачаецца. Чорны каршун занесены ў Чырвоную кнігу.

5 У 2015 годзе на большай частцы тэрыторыі створаны рэспубліканскі водна-балотны заказнік "Пойма ракі Сож".

## Што пагражае ТВП "Пойма ракі Сож"?

- Веснавое паляванне на водна-балотных птушак не дае магчымасці мігруючым птушкам назапасіць пажыўныя рэчывы для працяглага пералёту і з'яўляецца моцным фактарам турбавання для відаў, якія гняздуюцца на дадзенай тэрыторыі.





- Інтэнсіўная рыбная лоўля, асабліва з выкарыстаннем маторных лодак, – моцны фактар турбавання птушак у час гнездавання. Найбольш шкоды гэта наносіць у пачатку чэрвеня, калі птушкі сядзяць на гнёздах ці гадуюць малых птушанят, а лодачны рух вельмі актыўны.

- Спыненне гаспадарчай дзейнасці ў пойме выклікае хуткае зарастанне адкрытых лугоў хмызнякамі, што з часам прывядзе да страты паплаваў.



